ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (868) ● ЧАЦВЕР, 7 снежня 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

## ДА СВЯТА КАНСТЫТУЦЫІ

Вялікае свята — Дзень Канстытуцыі СССР — студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта адзначылі ў гэтым годзе напярэдадні 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР. На факультэтах, у групах і на курсах праведзены гутаркі і прачытаны лекцыі, прысвечаныя святу, адбыліся сустрэчы з цікавымі людзьмі, вечары, выступленні мастацкай самадзейнасці.

Юрысты, напрыклад, правялі святочны «Агеньчык», які праходзіў у інтэрнаце № 5. У ім прыняў удзел вакальна-інструментальны ансамбль факультэта «Ваганты». А студэнты-філолагі запрасілі да сябе сваіх даўніх сяброў — курсантаў ВІРТУ і разам правялі святочны вечар. Прайшоў вечар і на гістарычным факультэце.

## ВЕСТКІ З ФІЛФАКА

◆ Да свята юбілею СССР на факультэце праводзіўся конкурс на лепшую тэматычную палітінфармацыю. Ужо вядомы пераможцы. Гэта 3-я група І курса аддзялення рускай мовы і літаратуры, 2-я і 3-я групы ІІ курса беларускай мовы і літаратуры, 4-я група ІІ курса аддзялення рускай мовы і літаратуры.

◆ Цікава прайшла сустрэча студэнтаў 2-й групы ІІ курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Яны запрасілі да сябе замежных студэнтаў. Прадстаўнікі Бангладэш, Конга, Сенегела, В'етнама, С'ера Леоне расказвалі аб сабе, сваіх народах, слухалі расказы беларускіх сяброў.

◆ У школах і на прадпрыемствах Мінска чытаюць лекцыі члены лектарскай групы філфака. Вучні школы-інтэрната № 2, рабочыя кандытарскай фабрыкі «Камунарка» і БУ-115 трэста № 7 з цікавасцю праслухалі гутаркі студэнтаў, прысвечаныя 50-годдзю ўтварэння СССР.

◆ Па традыцыі першакурснікі, каб атрымаць права ўдзелу ў факультэцкіх гуртках мастацкай самадзейнасці, дэманстравалі сваё майстэрства на аглядзе мастацкай самадзейнасці першых курсаў. Пасля гэтага агляду танцавальны гурток і хор факультэта папоўняцца новымі ўдзельнікамі.

◆ Многа добрых спраў на рахунку педатрадаў трэціх курсаў факультэта. Яны выступаюць з гутаркамі і канцэртамі ў падшэфных доманкіраўніцтвах, арганізавалі і вядуць работу пры іх у танцавальных, харавых і спартыўных гуртках.

Т. ЗАСІМ.

## ДОБРЫЯ ВЫНІКІ

Яшчэ ў снежні мінулага года прафком і камітэт камсамола універсітэта аб'явілі конкурс на лепшую групу ў гонар XV з'езда ВЦСПС і 50-годдзя СССР. Галоўная мэта яго — выхаванне ў студэнтаў сумленных, творчых адносін да вучобы, згуртаванне калектываў студэнцкіх груп.

Вынікі першага тура былі падведзены ў красавіку гэтага года. А нядаўна прафком і камітэт камсамола падвялі вынікі другога тура. Трэба адзначыць, што задачы, якія стаялі перад конкурсам, поўнасцю выкананы. Значна павысіўся ўзровень ведаў студэнтаў, больш актыўным стаў іх удзел у навуковай рабоце, спорце, мастацкай самадзейнасці, у працоўным семестры. Для прыкладу можна прывесці студэнцкую групу IV курса аддзялення палітэканоміі гістфака, якая заняла ў конкурсе I месца сярод гуманітарных факультэтаў. Агульны бал паспяховасці ў ёй склаў 4,55. Кожны студэнт выконвае грамадскія абавязкі. З 24 чалавек 12 займаецца спортам, 11 — мастацкай самадзейнасцю. Усе студэнты прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай працы. 11 з іх удзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

Добрых поспехаў дабіліся і студэнты трэцяй групы III курса факультэта журналістыкі. Яны занялі II месца. Трэцяе месца па ўмовах конкурсу сярод гуманітарных факультэтаў занялі студэнты чацвёртай групы II курса юрфака.

Сярод прыродазнаўчых факультэтаў I месца прысуджана чацвёртай групе III курса ФПМ, II — дзевятай групе II курса матфака і III — першай групе IV курса фізфака.

Пераможцы конкурсу ўзнагароджаны прафкомам універсітэта паездкамі ў гарады Ленінград, Брэст і ў Белавежскую пушчу.

М. ДРОЗД,
старшыня прафкома БДУ.





*Лекцыю па гісторыі дзяржавы і права БССР для студэнтаў II курса юрфака чытае дацэнт І. А. Юхо.* *Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

## ШЛЯХ У НАВУКУ

Як падкрэслівалася на пленарным пасяджэнні канферэнцыі, якая праходзіла ў Маскве, навуковая работа студэнтаў з'яўляецца першаасновай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, будучых вучоных, і ўдзел у ёй павінен расцэньвацца як выкананне важнай дзяржаўнай задачы. І тут няма перабольшання. Выступаўшыя на канферэнцыі вядомыя савецкія вучоныя падкрэслівалі, што некаторыя работы студэнтаў маюць вялікую навуковую каштоўнасць, выкананы на ўзроўні кандыдацкіх дысертацый і будуць прадстаўлены для дадатковага рэцэнзавання і абмеркавання ў АН СССР.

Залогам якаснага паляпшэння зместу работ з'яўляецца колькасны рост, актывізацыя творчай дзейнасці студэнтаў. Для таго, каб яна прыняла сапраўды масавы характар, неабходна, па-першае, шырокая і паўсядзённая прапаганда навуковай работы студэнтаў па ўсіх напрамках — з трыбуны партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх сходаў. Камсамол павінен пастаянна падтрымліваць дзелавыя сувязі з навуковымі гурткамі, кафедрамі, ведаць кожнага студэнта, які займаецца навукай, заахвочваць яго творчы пошук, усямерна клапаціцца аб росце новых кадраў. І, па-другое, неабходна больш цесная і гібкая сувязь паміж самімі кафедрамі, гурткамі, СНТ на факультэтах.

У прыватнасці карыснымі будуць такія формы работы, як сумесныя пасяджэнні навуковых гурткоў, арганізацыя дыспутаў, абмен дакладамі па сучасных, найбольш дыскусійных пытаннях, якія ўзнікаюць на стыку розных навук.

У нас на гістфаку нядаўна быў арганізаван па ініцыятыве студэнтаў філасофскага аддзялення гурток па вывучэнню агульных праблем фармальнай і дыялектычнай логікі (навуковы кіраўнік кандыдат філасофскіх навук У. Ф. Беркаў). Нашы даследаванні носяць пераважна прыкладны метадалагічны характар. Мы імкнемся знайсці выхад логікі навуковага пазнання ў спецыяльныя навукі, выявіць яе арганічную сувязь з фізікай, матэматыкай, біялогіяй, кібернетыкай і г. д. Карыстаючыся выпадкам, я звяртаюся да студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў, асабліва да фізікаў, прыняць актыўны ўдзел у рабоце нашага гуртка.

Навуковая дзейнасць студэнта мае сваю спецыфіку. Насычанасць вучэбнай праграмы стварае пэўныя цяжкасці ў гэтым плане. Узнікае неабходнасць максімальна, да дробязі рэгламентаваць свой час, берагчы яго. Я не буду спыняцца на дэталях: вельмі добрыя рэкамендацыі па гэтаму пытанню ёсць у артыкуле К. Смірнова «Пахвальнае слова самаадукацыі» («Комсомольская правда», 14 лістапада 1972 г.). Мне б хацелася толькі падзяліцца сваімі думкамі, поглядамі з асабістага вопыту.

Калі я пісаў работу на конкурс, то нават пры добрай, як мне здавалася, арганізацыі працы часу мне не хапала. Даводзілася, на жаль, часам прапускаць лекцыі.

Для таго, каб пераадолець гэтую цяжкасць, магчыма, было б правільна выдзеліць адзін дзень тыдня (напрыклад, суботу) для заняткаў навуковай, а таксама самастойнай працай па вучэбнай праграме, размеркаваўшы тры пары лекцый на іншыя дні тыдня. Гэта ўжо практыкуецца ў некаторых вну Саюза, у прыватнасці ў Маскоўскім хіміка-тэхналагічным інстытуце імя Д. І. Мендзялеева.

Мне здаецца (і гэта не толькі мая думка), што своеасаблівая «пяцідзёнка» садзейнічала б актывізацыі творчай дзейнасці студэнтаў, узмацніла б у іх цягу да самаадукацыі, павышэння інтэлектуальнага ўзроўню.

Некаторыя студэнты, займаючыся навуковай працай, часта захапляюцца паглыбленнем вялікай колькасці інфармацыі. У выніку ў іх не застаецца часу і сіл для выказвання асабістых думак, выкладання іх у канкрэтным даследаванні. Безумоўна, для таго, каб сказаць сваё слова ў навуцы, трэба многа прачытаць і пераасэнсаваць па вывучаемай праблеме. Але гэтая праца можа страціць сваё значэнне, калі час ад часу не «выдаваць на гара», не паспрабаваць свае сілы і веды ў навуковым пошуку. Трэба асвойваць мову навукі, вучыцца фармуліраваць свае думкі ў зразумелай, простай, выразнай форме, лагічна разгортваць змест вывучаемай праблемы.

Памятаю, амаль усе лісты сваёй работы я перапісваў па некалькі разоў, дабіваючыся лепшага выкладання думак, і ўсё ж у гэтым напрамку я і цяпер далёкі ад дасканаласці. Таму калі коратка адказаць на пытанне, што ляжыць у аснове навуковай працы студэнта, можна сказаць: праца, праца і яшчэ раз праца — паўсядзённая, паглыбленая, мэтанакіраваная і нават самаадданая. Толькі ў такім выпадку можна стаць карысным навуцы і патрэбным грамадству чалавекам.

І. ШЫРШОЎ,
студэнт IV курса аддзялення філасофіі, лаўрэат IV Усесаюзнага конкурсу па праблемах грамадскіх навук.

## Што такое рэцэнзія?

Пад такой назвай адбылося нядаўна на факультэце журналістыкі першае пасяджэнне гуртка рэцэнзентаў. Кіраўнік яго — дацэнт кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Ефрасіння Леанідаўна Бондарава. Яна з прысутнымі вяла гаворку аб ролі і месцы рэцэнзіі на старонках перыядычнага друку. Атрыманы першыя заданні. Да наступнага пасяджэння, напрыклад, удзельнікі гуртка павінны зрабіць рэцэнзіі на новыя мастацкія фільмы «Печкі-лавачкі», «Від на жыхарства», «Ты і я». Кожны з удзельнікаў будзе мець магчымасць выказаць свае думкі і меркаванні, паспрачацца, паспрабаваць свае сілы ў жанры рэцэнзіі.

С. ХОРСУН.

У ДАПАМОГУ ПАЛІТІНФАРМАТАРУ

СССР 50

# САВЕЦКІ САЮЗ ЗА ПАЎВЕКА

## ПОСТУП ІНДУСТРЫІ

Стварэнне за параўнаўча кароткі тэрмін гіганцкага эканамічнага патэнцыялу ў СССР — яскравае пацвярджэнне буйнейшых пераваг сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі, правільнасці ленінскай генеральнай лініі партыі. Канцэнтрацыя матэрыяльных сродкаў і намаганняў, бескарысная ўзаемадапамога савецкіх народаў дазволілі забяспечыць велізарны рост грамадскага багацця кожнай рэспублікі і ўсёй краіны.

У параўнанні з 1922 годам аб'ём нацыянальнага даходу СССР павялічыўся ў 1971 годзе ў 105 разоў, а з улікам выканання плана бягучага года — у 112. Пры значным павелічэнні вагі кожнага працэнта тэмпы росту яго застаюцца нязменна высокімі, апярэджваючы тэмпы росту нацыянальнага даходу многіх развітых капіталістычных дзяржаў. За перыяд з 1950 па 1971 год нацыянальны даход у нас вырас у 5,6 раза, у ЗША—у 2, Англіі — у 1,7, Францыі — у 2,8, Італіі—у 2,9 раза.

Нацыянальнае багацце СССР складае цяпер больш трыльёна рублёў.

У 1972 годзе ў параўнанні з 1922 годам агульны аб'ём прадукцыі прамысловасці павялічыўся ў 321 раз, у тым ліку сродкаў вытворчасці (група «А») у 822 разы і сродкаў ужытку (група «Б») у 102 разы.

Сапраўды грандыёзны рост характэрны для ўсіх галін народнай гаспадаркі. Так, калі ў 1922 годзе электрастанцыі краіны выпрацоўвалі 0,8 мільярда кілават-гадзін электраэнергіі, то ў бягучым годзе вытворчасць яе дасягне 863 мільярдаў кілават-гадзін. Здабыча нафты (уключаючы газавы кандэнсат) узрасце да 404 мільёнаў тон і будзе ў 87 разоў большая, чым у год утварэння СССР.

Доля Савецкай краіны ў прамысловай вытворчасці свету складала ў 1922 годзе прыкладна адзін працэнт. Цяпер яна дасягнула адной пятай.

У цяперашні час Савецкі Саюз пераўзышоў ЗША не толькі па сярэднегадавых тэмпах прыросту прамысловай прадукцыі (за 1951 — 1971 гады яны складалі адпаведна 10 і 4,2 працэнта), але і па абсалютнаму прыросту выпуску многіх важных відаў прадукцыі. У 1971 годзе ў нас выпушчана чыгуну на 20 працэнтаў больш, чым у ЗША, цэменту—на 43 працэнты, баваўняна-папяровых тканін — на 14 працэнтаў, шарсцяных тканін — амаль у чатыры разы, цукру-пяску — на 56 працэнтаў.

Тое, як імкліва скарачаўся разрыў паміж Савецкай краінай і самай магутнай дзяржавай капіталістычнага свету, добра відаць на росце выплаўкі сталі. У 1922 годзе Савецкі Саюз выплаўляў усяго 0,3 мільёна тон сталі, або адзін працэнт да ўзроўню ЗША. У 1971 годзе СССР дасягнуў выплаўкі сталі 120,7 мільёна тон, што больш, чым у любой краіне свету.

У пачатку рэканструкцыі народнай гаспадаркі Савецкі Саюз увозіў машыны і абсталяванне, таму што па сутнасці не меў уласнай базы машынабудавання. У 1922 годзе ў краіне выпускалася 0,3 тысячы штук металарэзных станкоў. Па плану 1972 года іх намечана выпусціць 208 тысяч штук: агульны парк металарэжучага і кузнечна-прэсавага абсталявання на пачатак бягучага года склаў больш 4,5 мільёна адзінак.

*За мінулыя паўвека народы СССР пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі прайшлі баявы шлях гераічных перамог. Выраслі і ўзмацніліся матэрыяльныя і духоўныя сілы нашай шматнацыянальнай сацыялістычнай дзяржавы.*

*Сёння мы публікуем матэрыялы, якія асвятляюць некаторыя вынікі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе за пяцьдзесят год.*

## УЗДЫМ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

У цяперашні час наша сельская гаспадарка налічвае 32,3 тысячы калгасаў і 15,5 тысячы саўгасаў. Гэта буйныя механізаваныя сацыялістычныя прадпрыемствы. Напрыклад, у мінулым годзе ў сярэднім на адзін калгас прыходзілася 6,2 тысячы гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, 63 трактары, 1.332 галавы буйной рагатай жывёлы і каля двух мільёнаў рублёў недзялімых фондаў у асноўных і абаротных сродках.

З кожным годам павялічваюцца пастаўкі ў сельскую гаспадарку машын і абсталявання. У 1971 годзе трактарны парк у сельскай гаспадарцы налічваў 2.046 тысяч машын. Колькасць збожжаўборачных камбайнаў дасягнула 639 тысяч, аўтамабіляў грузавых — 1.243 тысяч.

Машыны ўсё шырэй прымяняюцца на палях і фермах. Яны аблегчылі працу земляроба, зрабілі яе больш прадукцыйнай. Гадавая прадукцыйнасць працы ва ўсёй сельскай гаспадарцы СССР у 1971 годзе павялічылася ў параўнанні з дарэвалюцыйным перыядам у 5,4 раза, гадзінная прадукцыйнасць працы ўзрасла больш чым у 6 разоў. Такія віды работ, як ворыва, пасеў збожжавых, бавоўны, цукровых буракоў, уборка збожжавых і сіласных культур, сёння поўнасцю механізаваны. 64 працэнты малочнага статку калгасаў і саўгасаў пераведзена на механізаванае даенне, 71 працэнт ферм буйной рагатай жывёлы і 83 працэнты свінаферм маюць водазабеспячэнне.

На аснове росту механізацыі і пастаўкі ўгнаенняў, гербіцыдаў, пашырэння фронту меліярацыйных работ сельская гаспадарка ўсё больш інтэнсіфікуецца. Да рэвалюцыі мінеральныя ўгнаенні амаль не прымяняліся. У 1940 годзе сельскай гаспадарцы было пастаўлена 3,2 мільёна тон мінеральных угнаенняў, а ў 1971 годзе — ужо 50,6 мільёна тон, што роўна 226,8 кілаграма ў разліку на адзін гектар ворыва.

Ураджайнасць збожжавых культур павысілася з 7,6 цэнтнера з гектара ў 1922 годзе да 15,4 цэнтнера ў 1971 годзе, ураджайнасць бавоўны-сырца — з 6,5 да 25,6 цэнтнера.

Значна расшырыліся плошчы паліўных і асушаных земель. Па даных за мінулы год агульная плошча паліўных земель складала 11,5 мільёна гектараў, прычым найбольш значныя масівы арошаны ў Узбекскай ССР, Расійскай Федэрацыі, Казахскай, Азербайджанскай і Украінскай рэспубліках. Плошча асушаных зямель дасягнула 10,9 мільёна гектараў. Пашырэнне работ па меліярацыі зямель, намечанае планам дзевятай пяцігодкі, будзе ва ўсё большай ступені вызваляць земляробства ад капрызаў прыроды.

У краіне значна павялічылася пагалоўе жывёлы. Так, калі на пачатак 1923 года ўсе катэгорыі складалі 41,8 мільёна галоў буйной рагатай жывёлы, то ў 1972 годзе — 102,4 мільёна галоў; пагалоўе свіней за гэты перыяд вырасла амаль у 7 разоў. Няўхільна павышалася і прадукцыйнасць жывёлагадоўлі.

Прагрэс земляробства і жывёлагадоўлі дазволіў істотна павялічыць вытворчасць і нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1971 годзе ў параўнанні з 1922 годам валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі павялічылася ў 4,8 раза.

## НАВУКА І ТЭХНІКА СЛУЖАЦЬ САЦЫЯЛІЗМУ

З перамогай сацыялізму створаны неабходныя ўмовы для шырокага выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і актыўнага ўдзелу працоўных усіх нацыянальнасцей у развіцці навукі і тэхнікі.

Развіццё навукі ва ўсіх савецкіх рэспубліках у многім вызначаецца ростам навуковых устаноў і кадраў. Да рэвалюцыі такіх устаноў было ўсяго 298, а ў 1971 годзе налічвалася 5.307, у тым ліку 2.648 навукова-даследчых інстытутаў, іх філіялаў і аддзяленняў. Дарэвалюцыйная Расія мела 11,6 тысячы навуковых супрацоўнікаў, цяпер у СССР іх 1.002,9 тысячы чалавек, або адна чацвёртая частка ўсіх навуковых супрацоўнікаў свету. Кожная савецкая рэспубліка мае сваю акадэмію навук.

Народнай гаспадарцы Савецкага Саюза ўласцівы высокія тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу. Колькасць упершыню створаных у СССР узораў новых тыпаў машын, абсталявання, апаратаў і прыбораў у 1951—1955 гг. складала 4.345, у 1956—1960 гг. — 12.902, у 1961—1965 гг. — 23.178, у 1966—1970 гг. — 21.272 і за адзін 1971 г.—3.873. За восьмую пяцігодку прадпрыемствамі машынабудавання знята з вытворчасці 2.476 устарэлых канструкцый машын, абсталявання, апаратаў і прыбораў. У краіне ўсё больш становіцца комплексна-механізаваных, аўтаматызаваных і комплексна - аўтаматызаваных цэхаў і прадпрыемстваў. У 1971 годзе налічвалася 18.187 такіх цэхаў і 4.984 прадпрыемствы. Механаўзброенасць працы ў будаўніцтве ў параўнанні з 1940 годам павысілася больш чым у дзесяць разоў.

Энергаўзброенасць працы ў вытворчасці ў параўнанні з дарэвалюцыйнай вырасла ў 27 разоў. У сельскай гаспадарцы ў разліку на аднаго працуючага яна склала ў 1971 годзе 12,1 конскіх сіл, або ў 24 разы больш, чым да рэвалюцыі. Сельская гаспадарка выкарыстала ў мінулым годзе 45.621 мільён кілават-гадзін электраэнергіі супраць 35 мільёнаў кілават-гадзін у 1928 годзе.

Навукова-тэхнічнаму прагрэсу садзейнічае тэхнічная творчасць працоўных розных нацыянальнасцей. З году ў год расце масавае рацыяналізатарства і вынаходніцтва. Колькасць рацыяналізатараў і вынаходнікаў, якія падалі прапановы, з 555 тысяч у 1950 годзе павялічылася да 3.709 тысяч у 1971 годзе, колькасць укаранёных у вытворчасць вынаходстваў і рацыяналізатарскіх прапаноў — адпаведна з 655 тысяч да 3.478 тысяч.

Прагрэс навукі і тэхнікі —галоўны рычаг стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. Усведамляючы гэта, працоўныя саюзных рэспублік робяць усё для таго, каб паспяхова вырашыць пастаўленую XXIV з'ездам КПСС задачу: арганічна спалучаць дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з перавагамі сацыялістычнай сістэмы гаспадарання.

## ДЛЯ ДАБРАБЫТУ НАРОДА

Аб'яднанне ўсіх сіл і рэсурсаў краіны дало магчымасць шматразова прымножыць вытворчасць матэрыяльных сродкаў і паўней выкарыстаць іх для паляпшэння жыцця працоўных. Галоўнае, што вызначае пры сацыялізме ўзровень народнага дабрабыту,—рост нацыянальнага даходу. Каля трох чвэрцей яго накіроўваецца на забеспячэнне матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей людзей. У выніку растуць рэальныя даходы насельніцтва. У параўнанні з дарэвалюцыйным узроўнем яны павялічыліся ў сярэднім на аднаго працуючага ў рабочых прамысловасці і будаўніцтва ў 8,3 раза, у сялян—амаль у 12 разоў. Прамысловая вытворчасць прадметаў спажывання вырасла за гэты перыяд у 32,8 раза.

Вылучыўшы ў якасці галоўнай задачы дзевятай пяцігодкі істотнае павышэнне дабрабыту працоўных, XXIV з'езд КПСС прадугледзеў далейшае павышэнне аплаты працы, за кошт чаго намячаецца забяспечыць тры чвэрці ўсяго прыросту рэальных даходаў насельніцтва. Партыя цвёрда і паслядоўна праводзіць гэты курс, аб чым сведчыць, напрыклад, павышэнне з 1 верасня 1972 года ставак і службовых акладаў урачоў, настаўнікаў і выхавацеляў дзіцячых дашкольных устаноў. З кожным годам павялічваецца сярэднемесячная грашовая заработная плата рабочых і служачых, якая складала ў 1971 годзе 126 рублёў, з дабаўленнем выплат і льгот — 170 рублёў. Агульная сума гэтых выплат і льгот з грамадскіх фондаў дасягала ў мінулым годзе 68,6 мільярда рублёў, у разліку на душу насельніцтва — 280 рублёў у год. З грамадскіх фондаў спажывання забяспечваюцца бясплатная медыцынская дапамога, бясплатнае навучанне, дапамогі, пенсіі, пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку і другія сацыяльныя выгоды. Велізарнае развіццё атрымала ва ўсіх саюзных рэспубліках народная ахова здароўя. Цяпер на дзесяць тысяч жыхароў налічваецца 28 урачоў і 111 бальнічных ложкаў, тады як да рэвалюцыі прыходзілася 1,8 урача і 13 бальнічных ложкаў, а на тэрыторыі рэспублік Сярэдняй Азіі, Казахстана — значна менш. Па забяспечанасці насельніцтва ўрачэбным персаналам СССР займае першае месца ў свеце.

Для паляпшэння ўмоў жыцця працоўных першаступеннае значэнне мае жыллёвае будаўніцтва, якое набыло ў СССР буйныя маштабы. Усяго за гады Савецкай улады пабудавана ў гарадах і вёсках жылля агульнай плошчай больш 2,5 мільярда квадратных метраў. У сярэднім на аднаго гарадскога жыхара прыходзіцца цяпер 11,2 квадратных метра агульнай (карыснай) плошчы. У апошні час штогод атрымліваюць новыя кватэры і паляпшаюць жыллёвыя ўмовы прыкладна 11 мільёнаў чалавек. Толькі ў 1971 годзе ў нас было пабудавана ў разліку на дзесяць тысяч чалавек насельніцтва 92 кватэры.

Савецкія людзі ўсё паўней забяспечваюць свае патрэбнасці, усё лепш жывуць, апранаюцца і харчуюцца. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, рознічны тавараабарот дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю, які ўзрос у 1971 годзе ў параўнанні з 1928 годам у 16 разоў і складае 676 рублёў на душу насельніцтва. Паказальнымі з'яўляюцца статыстычныя даныя, якія характарызуюць змены ў структуры харчавання сем'яў рабочых Масквы, Ленінграда, Харкава, Данбаса, Горкаўскай, Свярдлоўскай і Іванаўскай абласцей. У параўнанні з 1922 годам у гэтых сем'ях у 1971 годзе значна павялічылася спажыванне на душу насельніцтва высакаякасных прадуктаў: мяса—з 11 да 81,4 кілаграма, малочных прадуктаў — з 62,1 да 388,6 кілаграма, цукру—з 3,1 да 33,5 кілаграма. Значныя змены такога ж характару адбыліся ў структуры харчавання сем'яў сялян.

Дабрабыт народа—вышэйшая мэта нашай партыі. На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва яна здзяйсняе больш глыбокі паварот эканомікі да рашэння задач, звязаных з павышэннем жыццёвага ўзроўню савецкіх людзей.

## РОСКВІТ КУЛЬТУРЫ

Разам з бурным развіццём вытворчых сіл і павышэннем матэрыяльнага дабрабыту савецкіх народаў дасягнула росквіту іх культура, сацыялістычная па зместу і нацыянальная па форме. Калі да рэвалюцыі амаль тры чвэрці насельніцтва было непісьменным, а многія народы не мелі сваёй пісьменнасці, то цяпер Саюз ССР — краіна поўнай пісьменнасці. На пачатак 1971-72 навучальнага года ўсімі відамі навучання было ахоплена 80,2 мільёна чалавек.

Як паказаў апошні перапіс насельніцтва, на тысячу чалавек, занятых у народнай гаспадарцы, маюць вышэйшую і сярэднюю (поўную і няпоўную) адукацыю ў цэлым па СССР 653, у РСФСР — 656, Украінскай ССР — 668, Узбекскай ССР —663, Азербайджанскай ССР—674, Грузінскай ССР —711, Армянскай ССР—697, Туркменскай ССР—682 чалавекі. Лік агульнаадукацыйных школ вырас за пяцьдзесят гадоў з 89 тысяч да 184 тысяч, колькасць вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў — з 1.180 да 5.071. У дарэвалюцыйнай Расіі было 12 універсітэтаў, прычым на тэрыторыі большасці цяперашніх саюзных рэспублік іх не было; цяпер у СССР —52 універсітэты, яны ёсць ва ўсіх саюзных рэспубліках. Няспынна расце колькасць супрацоўнікаў, занятых пераважна разумовай працай. У 1926 годзе іх налічвалася менш 3 мільёнаў, цяпер — звыш 30 мільёнаў чалавек.

У нябачаных раней маштабах ствараюцца і публікуюцца на мовах народаў СССР творы літаратуры і мастацтва, навуковыя працы, выпускаюцца газеты, часопісы. За гады Савецкай улады выйшла больш 2,4 мільёна кніг агульным тыражом 38,3 мільярда экземпляраў. Кнігі выдаваліся на 145 мовах, у тым ліку на 89 мовах народаў СССР, прычым больш чым у 40 народаў пісьменнасць узнікла пасля Вялікага Кастрычніка. У краіне выпускаецца 7.863 газеты, 5.966 часопісаў і другіх перыядычных выданняў.

Ва ўсіх саюзных рэспубліках створана шырокая сетка культурна-асветных устаноў. Колькасць бібліятэк усіх відаў павялічылася ў параўнанні з дарэвалюцыйным перыядам у 4,7 раза і складае 359,6 тысячы. У 1922 годзе ў краіне было 868 кінаўстановак, з якіх 181 знаходзілася ў сельскай мясцовасці, а цяпер у СССР 157,1 тысячы кінаўстановак, з іх 133,1 тысячы ў сёлах і вёсках. Колькасць клубаў узрасла з 12 тысяч у 1922 годзе да 133 тысяч у 1971 годзе. Кожная рэспубліка мае свае прафесіянальныя тэатры, лік якіх у краіне — 533. У калектывах мастацкай самадзейнасці ўдзельнічала ў 1971 годзе 14 мільёнаў чалавек.

Дзевятая пяцігодка адкрыла шырокія перспектывы далейшага росквіту духоўнага жыцця народаў СССР.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

# ПЕДАГОГ І ВУЧОНЫ

7 снежня 1972 года спаўняецца 60 год з дня нараджэння доктара эканамічных навук, прафесара, загадчыка кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін, дэкана геаграфічнага факультэта Мікалая Тарасавіча Рамаsucceededўскага.



Нарадзіўся М. Т. Рамаўскі ў прыгарадзе Мінска, у сям'і селяніна. Працоўную дзейнасць пачаў з 1931 года, спачатку рабочым на цагельным заводзе, калектарам геалагічнай партыі. У 1934 годзе паступіў у Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава, які закончыў у 1938 годзе. Быў прынят у аспірантуру універсітэта па спецыяльнасці «эканамічная геаграфія». У пачатку 1941 года напісаў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Размяшчэнне тарфяных рэсурсаў і торфаздабычы ў Беларусі». Аднак вайна перашкодзіла яе абараніць. У акупіраваным гітлераўцамі Мінску М. Т. Рамаўскі быў удзельнікам падполля, выконваў спецыяльныя заданні Савецкай Арміі. Узнагароджан ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі, трыма медалямі.

Пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў М. Т. Рамаўскі працуе дырэктарам статыстычнага тэхнікума і старшым выкладчыкам эканамічнай геаграфіі ва універсітэце. У 1946 годзе ён абараняе кандыдацкую дысертацыю і пераходзіць на працу ва універсітэт. За час навукова-педагагічнай дзейнасці ім апублікавана звыш 60 прац. Большая частка з іх прысвечана пытанням развіцця эканомікі і культуры Беларускай ССР, яе асобных абласцей, гарадоў за гады Савецкай улады. Вядомы кнігі і манаграфіі, падрыхтаваныя і выдадзеныя з удзелам М. Т. Рамаўскага: «Геаграфія БССР» (1952 г.), «Беларуская ССР» (1958 г.), «Геаграфія Беларусі» (1966 г.), «Беларусь» (1967 г.) і іншыя.

Важны ўклад унёс М. Т. Рамаўскі ў вывучэнне развіцця мануфактурнай прамысловасці Беларусі. Гэтай праблеме прысвечана буйная манаграфія і доктарская дысертацыя на тэму «Развіццё мануфактурнай прамысловасці Беларусі (канец XVIII — пачатак XIX ст.)», якая паспяхова абаронена ў 1970 годзе. Дзесяткі артыкулаў аб Беларусі, замежных краінах апублікаваны Мікалаем Тарасавічам у БСЭ і БелСЭ.

Свае веды і багаты вопыт М. Т. Рамаўскі ахвотна перадае студэнтам і маладым вучоным. Шэсць яго аспірантаў і спаборнікаў паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Навукова-педагагічную дзейнасць М. Т. Рамаўскі ўмела спалучае з вялікай арганізацыйнай і грамадскай работай. На працягу многіх год ён з'яўляецца дэканам геаграфічнага факультэта, загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін, вучоным сакратаром савета універсітэта, намеснікам старшыні вучонага савета па біялагічных і геаграфічных навуках, членам партбюро факультэта. Часта выступае перад студэнтамі і працоўнымі з лекцыямі і дакладамі. Пры выкананні даручэнняў праяўляе прынцыповасць і партыйныя адносіны да справы. Карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод студэнтаў і выкладчыкаў.

За актыўную навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць Мікалай Тарасавіч Рамаўскі ўзнагароджан двума Ганаровымі граматамі і граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалем «За доблесную працу».

Калектыў студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў геаграфічнага факультэта сардэчна віншуе Мікалая Тарасавіча Рамаўскага з юбілеем і жадае яму добрага здароўя і многіх год актыўнай творчай дзейнасці.

**В. ЗАЎРЫЕЎ,**
**І. ТРУХАН.**

# ДА ПРЫХОДУ СЕСІІ

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Хутка зімовая сесія, пачаліся першыя залікі. З чым прыходзяць студэнты да яе, як рыхтуюцца? З гэтымі пытаннямі наш карэспандэнт **Л. Перасыпкіна** звярнулася да выкладчыка геаграфічнага факультэта Леаніда Вячаслававіча Быліны, які праводзіць практычныя заняткі па геалогіі і карысных выкапнях СССР на III курсе фізгеографаў.

**— Леанід Вячаслававіч, раскажыце, калі ласка, як праходзяць практычныя заняткі па вашаму курсу? Наколькі актыўнымі бываюць на іх студэнты?**

— Тэма нашых сённяшніх заняткаў — «Геалагічная будова і карысныя выкапні Сібірскай платформы». Як заўсёды, я паспяваю апытаць чалавек 10—12. Пытанні імкнуся задаваць такія, каб высветліць, знаём студэнт з тэмай ці не. Затым студэнты атрымліваюць заданне. Сёння яны выконвалі тэктанічныя карты СССР з нанясеннем месцанараджэнняў вугалю, нафты, газу. Спачатку тэма абмяркоўваецца, затым студэнты працуюць самастойна. Работа патрабуе ведаў і арыенціроўкі на контурных картах. У канцы студэнты здаюць заданні мінулых заняткаў.

Актыўнасць студэнтаў? Справа ў тым, што наша сістэма правядзення практычных не дае студэнтам магчымасці быць пасіўнымі. Адказваць я выклікаю па спісу. Той, хто адказвае на «дрэнна», павінен падрыхтаваць гэты ж матэрыял да наступных заняткаў. Калі я заўважаю, што студэнт пачынае дрэнна рыхтавацца, я выклікаю яго на кожных занятках, каб не даць яму заспакоіцца.

**— Ці можаце Вы сказаць, што з набліжэннем сесіі студэнты больш сур'ёзна адносяцца да падрыхтоўкі да практычных заняткаў?**

— Студэнты самі разумеюць усю адказнасць падрыхтоўкі да сесіі. Ды і мы, выкладчыкі, як я ўжо гаварыў, не даём ім заспакоіцца, раім прачытваць лекцыі, бо курс у нас цяжкі.

**— Як уплывае падрыхтоўка да практычных заняткаў на адказы на заліку або экзамене?**

— Залік па нашаму курсу праходзіць як экзамен. Студэнт атрымлівае білет з трыма пытаннямі. Прычым, акрамя адказу, улічваецца наведваемасць заняткаў, бягучая паспяховасць. Калі студэнт рыхтуецца да практычных, ён упэўнена адчувае сябе на заліку: не пачынае здалёку, не хавае вочы.

**— Ці згодны Вы з меркаваннем некаторых студэнтаў, быццам не абавязкова сістэматычна рыхтавацца да практычных, а можна вывучыць увесь матэрыял за час, адпушчаны для падрыхтоўкі да экзаменаў?**

— Іменна такія студэнты, як правіла, правальваюцца на экзамене. Толькі рэгулярная падрыхтоўка дасць добры вынік. Бываюць выпадкі, што можна здаць «штурмам». Але выйдзе такі чалавек з аўдыторыі і ўсё забудзе. Значыць, не засвоіў матэрыял. Які ж з яго спецыяліст атрымаецца!.

Ну, а каб не пакідаць усё на перадэкзаменацыйныя дні, трэба імкнуцца своечасова засвойваць тэмы. Для гэтага—састаўляць графік работы, каб лепш выкарыстоўваць свой час. Толькі так можна дабіцца поспехаў.

# У ГОСЦІ ДА ХЛЕБАРОБАЎ

**Не першы год існуе на гістфаку агітбрыгада. Яе удзельнікі выязджаюць у падшэфныя воінскія часці, калгасы, саўгасы, школы.**

**У гэтым навучальным годзе наша брыгада пабывала ў вёсцы Гарадзішча Мінскага раёна па запрашэнню партткома саўгаса імя Дзяржынскага для ўдзелу ў святкаванні 55-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пасля віншавання са святам мы пачалі канцэрт. Як адзначыў старшыня калгаса, ён прайшоў на высокім палітычным і мастацкім узроўні.**

**Цёпла сустрэлі гледачы наш вакальна-інструментальны ансамбль «Сябры» з удзелам Ю. Андрэйчанкі, Л. Касько, Э. Доўнар, Т. Баляснікавай. А колькі смеху было, калі выступаў тэатр мініяцюр! Ён паказаў сцэнкі са студэнцкага жыцця.**

**Г. КУЛАЖАНКА,**
загадчык сектара культмасавай работы, студэнт III курса.

# ВЕЧАР КНІГІ

У канцы лістапада бібліятэкай БДУ быў праведзен літаратурны вечар «Кніга— крыніца ведаў», прысвечаны Міжнароднаму году кнігі. Ён прайшоў вельмі цікава. На сустрэчу са студэнтамі прыйшлі вядомыя беларускія паэты Алег Лойка і Еўдакія Лось, якія прачыталі свае вершы. Дацэнт хімічнага факультэта А. А. Вечар і студэнткі Людміла Цітова і Наташа Прончанка расказалі аб ролі кнігі ў іх жыцці, аб рабоце і вучобе.

З цікавымі паведамленнямі аб гісторыі стварэння кнігі выступіла выкладчыца філалагічнага факультэта Т. Л. Мартынюк.

Праграму вечара цікава вялі студэнты факультэта журналістыкі Тэрэза Падгайная і Уладзімір Субат. Удзельнікам вечара была прапанавана літаратурная віктарына аб кнізе і чытанні. Пераможцам віктарыны былі падрыхтаваны прызы.

Вельмі шкада, што на гэты вечар прыйшло мала студэнтаў, хоць бібліятэкай была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа. Па гэтаму пытанню мы звярталіся да дэканаў факультэтаў, іх намеснікаў, але і гэта не дало належных вынікаў. Безадказна аднесліся і сакратары камсамольскіх арганізацый факультэтаў, у выніку многія студэнты, відаць, і не ведалі аб правядзенні такога вечара.

**В. ДАЙНЕКА,**
ст. бібліятэкар, адказны за масавую работу.

# КВЗ—спрэчкі, жарты, гумар





У паўфінальным матчы вясёлых і знаходлівых скрыжавалі «шпагі гумару» каманды факультэта журналістыкі і філфака.

Апошнія хвіліны перад пачаткам паядынку... Сапернікі абменьваюцца позіркамі, ацэньваюць і ўзважваюць годнасць і магчымасці адзін аднаго. Аб тым, што сустрэча павінна быць захапляючай, сведчылі шматлікія малюнкі і заклікі. Стан здароўя членаў каманд і балельшчыкаў: ціск — пакуль што нішто; дыханне — затоенае; тэмпература—40, 80, 100...; лік—0:0; хто стане пераможцам — невядома.

Нарэшце, пачатак: на сцэне з'яўляюцца члены каманд. Яшчэ спрэчкі пасапраўднаму не пачаліся, таму на тварах не відаць асаблівага жадання выйсці ў фінал. Сапернікі абменьваюцца дружалюбнымі прывітаннямі, сыплюцца кампліменты ў адрас журы і балельшчыкаў.

Пачынаецца размінка. Першымі «разведку боем» пачалі філолагі. Кожнае пытанне стала самастойным конкурсам і патрабавала трапных адказаў. У гэтым спаборніцтве абедзве каманды дэманструюць эрудыцыю, але «гімнастыка розуму» заканчваецца на карысць філолагаў з лікам 14:12.

Становішча робіцца больш напружаным. Журналісты не губляюць прысутнасці духу. На сцэне — прэс-цэнтр, які праяўляе прафесійнае майстэрства, аператыўнасць і знаходлівасць.

У радах філолагаў — лёгкае замяшанне. Але ў самы напружаны момант балельшчыкі ўскідваюць заклік: «Трымайся, філолаг!» Спаборніцтва інтэлектуалаў, у якім прымаюць удзел не толькі члены каманд, але і балельшчыкі, працягваецца.

Дамашняе заданне заўсёды патрабуе немалых сіл і энергіі, знаходлівасці дасціпнікаў, якія пішуць рэпрызы, талента вітасці кампазітараў — аматараў і самадзейных мастакоў.

Тэма сённяшняга дамашняга задання — «Мы будуем». Філолагі «ставяць» будынак факультэта журналістыкі.

Тым часам пад гукі музыкі на сцэне з'яўляецца чалавек, які цягне праекцыйны апарат з «дынамамашынай». Журфакаўцы паказваюць ілюзійныя карцінкі на самыя галоўныя тэмы студэнцкага жыцця.

Час КВЗ строга рэгламентаван: члены каманд і ў конкурсе бескарыслівых парад пачынаючаму літаратару, і ў конкурсе-рэкламе павінны імправізаваць свае выступленне на хаду.

Сілы каманд вось-вось падыйдуць к канцу, напружанасць узрастае. На капітанскі мосцік запрашаюцца капітаны. Але журналістаў тут напаткала няўдача. З лікам 39:36 перамогу атрымалі філолагі.

Яны выйшлі ў фінал гульні, дзе сустрэнуцца з камандай КВЗ матэматычнага факультэта.

**Ж. ЗАЛОЗНАЯ.**
Фота **М. Дарожнага.**






# ДВАЦЦАЦЬ ДЗЕВЯЦЬ НЯЎРЫМСЛІВ[illegible]

Мінулая сесія для пяцікурснікаў філфака была адной з нялёгкіх. Здавалі чатыры экзамены і амаль удвая больш залікаў.

Хутка праляцелі бяссонныя ночы за падручнікамі, адышлі хваляванні перад дзвярыма аўдыторый, радасці пасля здачы апошняга экзамена. Як заўсёды, толькі выдатнымі адзнакамі папоўніліся заліковыя кніжкі Люды Кулак, Ларысы Армонік, Валянціны Клешч, Людмілы Пасюк, Ніны Ракавецкай.

Па выніках сесіі лепшай на 5 курсе была прызнана другая група рускага аддзялення, дзе куратарам Ілья Цімафеевіч Ішчанка.

На маё пытанне, ці заўсёды група так паспяхова здае экзамены, стараста Ніна РАКАВЕЦКАЯ адказала:

— За чатыры гады вучобы ў нас не было яшчэ ніводнай нездавальняючай адзнакі, і таму невыпадкова, што гэтую сесію мы здалі так добра. Да яе мы рыхтаваліся, як ніколі. Перад кожным экзаменам праводзілі своеасаблівыя кансультацыі: за дзень да экзамена збіраліся ўсе разам і на кожнае пытанне адна з нас адказвала, а астатнія дапаўнялі. Незразумелыя пытанні высвятлялі ўсе разам.

Вучоба — галоўны занятак студэнтаў. А як адпачываюць пяцікурснікі?

Адказвае Тамара ПАТАПАВА, прафорг групы:

— У нашай групе 29 дзяўчат, сумаваць нам некалі. Амаль усе займаліся ў гуртках мастацкай самадзейнасці факультэта. Зараз, праўда, ужо амаль усю ўвагу аддаем практыцы, якую праходзім у школах Мінска. Некалькі нашых студэнтак удзельнічалі ў СНТ. Трое з іх за навуковыя работы былі ўзнагароджаны дыпломамі на рэспубліканскім конкурсе. Наташа Алейнікава чатыры гады выступала ў студэнцкім драматычным тэатры. Часта ходзім разам у кіно, тэатры, а потым абмяркоўваем прагледжанае.

Адказ Тамары дапаўняе Наташа АЛЕЙНІКАВА, завадатар усіх цікавых спраў у групе. Гэта па яе ініцыятыве ў дзень нараджэння ўсе разам віншуюць сваю сяброўку са святам.

Часта можна сустрэць дзяўчат філфака і ў бюро экскурсій «Спадарожнік», дзе яны працуюць гідамі, перакладчыкамі.

Любяць у групе і спорт. Штогод амаль усе дзяўчаты прымалі ўдзел у кросах, выступалі за[illegible] на спарты[illegible]вах.

Рэдка [illegible] сустракацц[illegible], толькі ў се[illegible]някі. І зн[illegible]раюцца уч[illegible] настаўніць[illegible]раджаюцца цікавыя размовы, прапановы, расказваюць яны аб першых кроках у педагагічную дзейнасць. Неўгамонна бурліць студэнцкае жыццё ў гэтай дзявочай групе.

У. СУБАТ.

# У ВНУ КРАІНЫ

⊙ У Данецкім політэхнічным інстытуце распрацаван комплекс аўтаматычнага кантролю бягучай паспяховасці «Кактус-70». Ён складаецца з трох асноўных вузлоў: пульта выкладчыка, дваццаці пяці пультаў для студэнтаў і светавога ацэначнага табло, размешчанага на адной са сцен лабараторыі.

Прымяненне машыннага метаду абумовіла сістэматычную і сур'ёзную падрыхтоўку студэнтаў да лабараторных заняткаў, аблегчыла працу выкладчыкаў па праверцы ведаў студэнтаў, дало магчымасць інтэнсіфікаваць навучальны працэс і знайсці час для вывучэння новых раздзелаў курса.

⊙ Студэнцкаму канструктарскаму бюро Саратаўскага універсітэта споўнілася 10 год. За час яго існавання больш двухсот студэнтаў фізічнага факультэта прынялі ўдзел у яго рабоце. Прыборы, зробленыя ў СКБ, экспанаваліся на ўсесаюзных, абласных, занальных і рэспубліканскіх выстаўках студэнцкіх работ.

⊙ 2 снежня адбыўся вечар дружбы студэнтаў Днепрапятроўскага і Гомельскага універсітэтаў.

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

**У снежні заканчваецца падпіска на газету «Беларускі універсітэт».**

**Падпіска афармляецца камсоргамі груп і камітэтамі камсамола факультэтаў.**

*Па пытаннях падпіскі звяртайцеся ў камітэт камсамола або рэдакцыю газеты.*

# У РОДНЫМ КУЦЕ ПЕСНЯРА



Па каржакаватаму ельніку, які пакрываўся санлівым снегам, мы пад'язджалі да месца, дзе нарадзіўся вялікі пясняр. Нас сустракалі засяроджаныя ліпы, што жывымі сведкамі коласаўскай памяці стаялі побач з леснічоўкай. Іх пасадзіў Якуб Колас у 1911 годзе, у час наведання сваіх бацькоў. А калі праз некалькі год завітаў сюды, то здзівіўся, убачыўшы свае дрэўцы, што высока глядзелі ў неба.

На парозе доміка стаяў загадчык музея, пляменнік паэта Міхаіл Канстанцінавіч Міцкевіч. Ён пазнаёміў з многімі экспанатамі музея.

Стараста Уладзімір Субат ад імя студэнтаў III курса журфака пакінуў у кнізе водгукаў цёплыя словы ўдзячнасці ўсім, хто працаваў над стварэннем музея, хто зараз знаёміць наведвальнікаў з яго экспанатамі.

Тэкст і фота **М. ХАМЦА.**





*На здымках:*

*«Колас любіў сядзець пад сваімі ліпамі...»— брат Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч.*

*«Сям'я Міцкевічаў была культурнай і адукаванай сялянскай сям'ёй...»— пляменнік Коласа Міхаіл Канстанцінавіч Міцкевіч.*

*«Вялікае дзякуй супрацоўнікам музея...»—Уладзімір Субат.*

*КНІГІ НАШЫХ ВЫПУСКНІКОЎ*

# «УСЮ РАДЗІМУ Ў СЭРЦЫ НЯСУ...»

«Мембрана»—новая, другая па ліку кніжка Казіміра Камейшы. У дакладным сэнсе мембрана — тонкая пласцінка, якая ўлаўлівае нават самыя нязначныя ваганні чалавечага голасу. Улічваючы тое, што кожны паэт імкнецца выказаць у назве галоўную думку, якая аб'ядноўвае ягоныя вершы, ёсць аб'ектыўная падстава меркаваць, што аўтар прэтэндуе на дакладнае і чуйнае ўспрыняцце рэчаіснасці. Таму будзе справядлівым разглядаць вершы маладога паэта менавіта з пазіцыі асабіста-філасофскага асэнсавання з'яў і падзей жыцця.

На старонках зборніка не знойдзеш тэмы, характэрнай толькі для К. Камейшы. Аўтар піша пра тое, што хвалюе і іншых паэтаў: пра вёску, дзяцінства, прыроду... Не абыходзіць ён і ваенную тэматыку. Але гэта зусім не азначае, што паэзія Казіміра Камейшы носіць аднабаковы характар, што яна не выдзяляецца з агульнай літаратурнай плыні і не заслугоўвае ўвагі.

Узрост аўтара робіць адбітак на яго творах, большасць з якіх адрасавана маладым чытачам і пабудавана як размова з сучаснікам, як роздум аб пражытым, убачаным, перадуманым, як споведзь перад нашым неспакойным часам.

Кіруе век з зямлі у неба крокі.
Касмічны рай, ён можа нас прыгрэць,
І будуць зоры вышыні далёкай
Ля нашых шчок зямным цяплом гарэць.
І, можа быць, за намі ўслед замкнуцца
Вароты самых небяспечных трас,
У космас манументы ірвануцца,
Што нам паставіць справядлівы час.

Сацыяльнае гучанне верша «Крылатасць», радкі з якога мы цытавалі, а таксама добрай паловы іншых твораў зборніка ідзе ад разумення паэтам той вялікай гуманістычнай місіі, якая ўскладзена на кожнага літаратара, — выхаванне ў людзей глыбокай веры ў жыццё, барацьба супраць пагрозы вайны, як і супраць зла наогул. «Ужо даўно агонь запален вечны — няма яшчэ ўсё вечнай цішыні»,—зазначае паэт у вершы «Сын». І словы гэтыя гучаць крыху трагічна, папярэджваючы аб небяспецы новай вайны, заклікаючы да пільнасці. Свежасць радка з'яўляецца вынікам асабістай заклапочанасці маладога паэта лёсам людзей. К. Камейша блізка да сэрца бярэ ўсё тое, пра што расказвае. Інакш бы не выйшлі з-пад пяра радкі верша «Поле».

...Лёс яго ўсяк вырашалі.
Я думаю часта аб тым —
Было яно больш пад шабляй,
Чым пад сярпом маім.
Там, дзе грачынай дарогай
Слалася баразна,
Лапаты вастрэй за нарогі,
Давалі у рукі нам.
Па росту свайму адмяралі
Кавалачак роднай зямлі.
Акопы, што мы капалі,
Магіламі часта былі.
Вязьмом наша памяць абвіта,
У сноп аб'яднана тугі.
Страшна таптаць праз жыта
Сцежкі да родных магіл.

Мастацкая каштоўнасць любога твора знаходзіцца ў прамой залежнасці ад жыццёвага вопыту і выхавання паэта, а яшчэ ад таго, наколькі поўна задавальняе даны твор духоўныя запатрабаванні чалавека. Нясе ён сухую інфармацыю ці пабуджае людзей да роздуму над праблемамі часу, над яшчэ нявырашанымі пытаннямі нашага жыцця. У сувязі з гэтым верш «Поле» мае поўнае права быць аднесеным да лепшых твораў Казіміра Камейшы, бо той запал, той публіцыстычны пафас, што закладзен у яго радках, выглядае больш пераканаўча, эмацыянальна і значна сталей, чым у іншых вершах зборніка. Каб лепш зразумець паэзію маладога аўтара, трэба ўбачыць, можа, нават адчуць складанасць прастаты яго слова, унутраную напружанасць думкі.

У вершы «Геолагі» аўтар піша, што «мы шукаць з маленства прывыклі, мы шукаем, мы многа яшчэ не знайшлі засакрэчаных выкапняў у душы і зямлі». Праблемы і клопаты, якія хвалююць паэта, не з'яўляюцца абстрактнымі. Яны народжаны канкрэтнымі падзеямі жыцця, канкрэтнымі абставінамі.

Мы пілавалі тут і палявалі,
Душой чысцелі ў чысціні расы.
Мы не заўсёды лес наш ратавалі,
Ды вечна ратавалі нас лясы.

Сказана праўдзіва і разумна. Лёгка перадаць сэнс паэтычнага радка, калі ён пазбаўлен багацця думкі, вобраза, калі ён нясе не больш як нейкую інфармацыю. Думаецца, што вершы К. Камейшы таму і цікавыя, што сагрэты чыстым пачуццём любві і павагі да ўсяго жывога, да чалавека. І, разам з тым, яны насычаны роздумам.

Кажуць, што паэт той, хто бачыць, хто знаходзіць паэзію там, дзе яе як быццам бы і няма. К. Камейшу не трэба запазычваць дэталі, штрыхі з чужых кніжак. Усё гэта малады аўтар бярэ са сваёй кнігі — кнігі жыцця. Кляновы ліст дрыжыць у Камейшы не як ліст, а як мембрана. І, ужо адыходзячы ад гэтай асацыяцыі, аўтар справядліва зазначае, што прырода, слухаючы нас, людзей, «трывогі нашы, радасці пагоду — усё яна ўловіць да драбніц. І слова наша вуснамі прыроды у іншым веку праўдай празвініць». Абразкі прыроды, большасць пейзажных замалёвак, якія займаюць у зборніку значнае месца, пададзены аўтарам не ў «голым» выглядзе, не апісальна, а ў сувязі з філасофскім і паэтычным асэнсаваннем убачанага. Паэт, трапіўшы на поплаў «у мядовай духаце», хоча «зразумець святла значэнне, якога многа тут». Праз адносіны да прыроды, да яе фарбаў, галасоў, водару паэт выказвае свае думкі і меркаванні аб жыцці. Грамадзянская сталасць К. Камейшы праяўляецца ў сцвярджэнні, што чалавеку немагчыма жыць без радзімы.

Ідзём у свет з адкрытымі вачыма,
Ідзём вяршыць, знаходзіць і здзіўляць.
Калі ёсць мы —
спакойнай будзь, Радзіма!
Калі ёсць ты —
спакойнай будзь, Зямля!

І гэта не дэкларацыя, а прадуманая і паслядоўная пазіцыя аўтара. Я не прыхільнік той думкі, што калі ў зборніку ёсць некалькі добрых вершаў, то ўжо гэта добра, бо, як кажуць у народзе, «адна ластаўка вясны не робіць». У зборніку Казіміра Камейшы «ластавак» многа. Адчуваецца адзінства ўсіх вершаў, своеасаблівы сплаў лірычна-філасофскага роздуму, тонкіх пачуццяў, сувязь паміж думкай і формай яе выказвання. Усё гэта стварае мастацкі вобраз, стварае партрэт сучасніка, партрэт чалавека нашых дзён.

З другога боку, К. Камейша, імкнучыся сказаць штосьці сваё, збіваецца часам на агульныя, усім вядомыя разважанні, на апісанне з'яў прыроды, замалёвак з натуры. Паэт, «запрошаны самой ракой, самой рачной дзяржавай», піша:

Глядзі, дзівіся і маўчы:
Згарбаціліся рыфы.
Як у тунелі, у карчы
Прахаджваюцца рыбы,
Яны размашыста ля шчок
Варушаць плаўнікамі...

Чытаючы такія радкі, ствараецца ўражанне, што паэт пісаў іх з халодным пачуццём абыякавасці, што ён бачыў сваю задачу ў тым, каб зафіксіраваць убачанае.

У вершы «Донары» Казімір Камейша зазначае: «Табе, жыццё, ніколі не спыніцца. Сцвярджаю я— ты вечнае, жыццё!» Сцвярджэнне гэта не новае. І ці была патрэба паўтараць яго!

У літаратуры няма той «палачкі-выручалачкі», стаўшы ўладальнікам якой можна паспяхова ісці ўперад, быць першаадкрывальнікам новага, свежага слова. Патрэбны прыродны талент і свой пункт гледжання на кожную дэталь, на кожны факт. Зрэшты, патрэбна нарадзіцца паэтам. Другая кніжка Казіміра Камейшы падмацоўвае праўдзівасць гэтых слоў і дазваляе чытачу спадзявацца, што чарговыя зборнікі паэта не страцяць грамадскага гучання, стануць працягам пачатай размовы пра людскую годнасць, пра сваіх маладых сучаснікаў, якія сэрцамі — самымі адчувальнымі мембранамі—успрымаюць жыццё.

Л. АНОП,
студэнт V курса
факультэта журналістыкі.

В. а. рэдактара
С. В. ГОВІН.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Тыраж 2.000 экз. Заказ. 1474. АТ 02489